«  »

2 красавіка ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта ВДУ адбылося адкрыццё выставы “Поры года” выпускніка гэтага факультэта 1970 года, мастака-педагога, члена Міжнароднай гільдыі жывапісцаў Віктара Данілава. Гэты праект (куратар М. Цыбульскі) рэалізаваны ў рамках Тыдня мастацка-графічнага факультэта і прысвечаны роднай для мастака альма-матар.

У экспазіцыі прадстаўлены жывапісныя работы В. Данілава – прыродныя і архітэктурныя пейзажы, нацюрморты. Многія з іх напісаны з натуры за адзін сеанс, бо яшчэ са студэнцкіх гадоў Віктар Данілаў палюбіў пленэрны жывапіс, калі падарожнічаў па СССР, працуючы над эцюдамі ў Самаркандзе і на Пскоўшчыне.

В.М. Данілаў шмат гадоў працаваў у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка і вядомы ў Беларусі як выдатны метадыст, складальнік навучальных праграм для школ і ўніверсітэтаў, метадычных дапаможнікаў. Менавіта таму добрым працягам выставы сталі лекцыя і майстар-класы па акварэлі, якія мастак правёў для студэнтаў віцебскага ўніверсітэта.

«  »

Важнай падзеяй таксама арганізаванай у рамках Тыдня мастацка-графічнага факультэта стала выстава дыпломных работ студэнтаў “Творчы дэбют”, якая адкрылася 5-га красавіка ў выставачнай зале Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея (куратар В. Осіпаў). У экспазіцыі былі прадстаўлены карціны ўсіх жанраў – ад нацюрморта і пейзажа да партрэта і тэматычнай шматфігурнай кампазіцыі. Вобразныя рашэнні карцін разнастайныя: пейзажы роднай Беларусі, міфалагічныя і казачныя сюжэты, нацюрморты з нацыянальным каларытам і г.д. На выставе таксама экспанаваліся работы студэнтаў з Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія вучацца на мастацка-графічным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава.

«  »

13 красавіка  на Мёршчыне – малой радзіме вядомага беларускага мастака, навукоўцы і педагога, прафесара кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Вячаслава Шамшура – адбылася значная культурная падзея. Адразу на дзвюх пляцоўках – у касцёле і ў раённай бібліятэцы былі арганізаваны выставы гэтага мастака, на якія завіталі родныя і знаёмыя аўтара, навучэнцы раённай школы мастацтваў, а таксама тыя, хто цікавіцца мастацтвам. У прысутнасці шматлікіх гасцей ён урачыста перадаў у дар Рыма-каталіцкай парафіі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мёрах і Мёрскай раённай бібліятэцы каля дзвюх дзясяткаў сваіх работ. Кампазіцыі, якія выкананы ў тэхніцы пастэль, мастак стварыў на працягу 1997–2020 гг. На палотнах адлюстраваны касцёл, набярэжная, старыя мёрскія вуліцы, а таксама лірычныя вясковыя пейзажы.

« »

Свой 55-гадовы юбілей адзначыў вядомы беларускі скульптар, жывапісец, графік і педагог Сяргей Сотнікаў (14.04.1969, г. Магілёў). Выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава (1994), сёння ён старшы выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва. С. Сотнікаў – удзельнік мастацкіх выставак з 1995 года, сябра Беларускага саюза мастакоў (2005). Працуе ў розных жанрах жывапісу і скульптуры, вядомы як аўтар шэрагу скульптурных кампазіцый, што прадстаўлены ў Віцебску, сярод якіх “Стары Хатабыч”, “Кветачніца”, “Двое”, “Лучоса”, “Віцебск гістарычны”, а таксама мемарыяла “5-ты полк”, памятных і мемарыяльных дошак, прысвечаных М. Шагалу, В. Цадкіну, С. Юркоўскаму, Р. Басу і інш. Творы мастака знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, Віцебскага мастацкага музея (філіяла УК “Віцебскі абласны краязнаўчы музей”), Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.У. Масленікава, Аршанскага музея У. Караткевіча (філіял УК “Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны”), у музеях і прыватных калекцыях у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой.

« »

22-га красавіка ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна адкрылася выстава пленэрных работ студэнтаў ІІ курса мастацка-графічнага факультэта “ПЛЕНЭР–2023”. Экспазіцыю выставы склалі графічныя накіды, замалёўкі і жывапісныя эцюды, якія выкананы акварэллю і гуашшу (куратары выставы – А. Антонычава і Ю. Багданава).

« »

24 красавіка на мастацка-графічным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава прайшлі сустрэча выпускнікоў 1970 года і круглы стол на тэму “Мастацтва і адукацыя: пераемнасць пакаленняў” (куратар праекта М. Цыбульскі).

Сярод амаль 60-ці выпускаў яго дзявяты выпуск быў неардынарны. Нават самі выкладчыкі лічылі яго адным з наймацнейшых, яркіх, творчых і называлі гэты выпуск “зорным”, бо вялікая частка яго выпускнікоў магутна заявіла пра сябе ў мастацтве, навуцы, педагогіцы. Сярод выпускнікоў гэтага года 12 сяброў Беларускага саюза мастакоў, тры кандыдаты навук, прафесар, вялікая колькасць мастакоў, педагогаў, настаўнікаў выяўленчага мастацтва і чарчэння, якія працавалі ў сярэдніх школах, каледжах, універсітэтах. Трое з гэтага выпуску прысвяцілі жыццё працы на родным факультэце (М. Гугнін, М. Аўсянікаў і В. Шамшур). Гэты курс вылучаўся высокай творчай актыўнасцю і сяброўскімі ўзаемаадносінамі. Па ініцыятыве выпускнікоў у скверы насупраць былога навучальнага корпуса мастацка-графічнага факультэта на скрыжаванні вуліц Суворава і Чэхава быў усталяваны вялікі валун, на якім вычаканілі надпіс “ХГФ-70”. Гэты камень і сёння захоўвае памяць аб тых часах, з’яўляецца своеасаблівым сімвалам дадзенага творчага пакалення.